Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________Д.В.Герасімёнак
_29 чэрвеня_ 2023 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________Ю.М.Галкоўская
_29 чэрвеня_ 2023 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# «УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ»

па спецыяльнасці
6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны
Прафілізацыя: Культурная спадчына і турызм

Складальнік:
Лупашка І.Г., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (пратакол № 10 ад 29.06.2023)

Складальнік:
Лупашка І.Г., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Рэцэнзенты:
Навукова-метадычны савет установы «Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы»;
С.А. Пацыенка, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат культуралогіі

Рэкамендавана да зацвярджэння кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 25.05.2023)

# ЗМЕСТ


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 6
2.1 Лекцыя 1 *Уводзіны* 6
2.2 Лекцыя 2 *Музеязнаўства як навука. Яе метады і задачы* 6
2.3 Лекцыя 3 *Гісторыя музейнай справы на Беларусі* 6
2.4 Лекцыя 4 *Сацыяльныя функцыі музеяў. Тыпалогія і класіфікацыя музеяў* 6
2.5 Лекцыя 5 *Асновы музейнага і турыстычнага заканадаўства* 7
2.6 Лекцыя 6 *Накірункі дзейнасці сучасных музеяў* 7
2.7 Лекцыя 7 *Буйнейшыя музеі на турыстычнай карце Беларусі* 7
2.8 Лекцыя 8 *Паняцце турызма. Класіфікацыя турызма* 7
2.9 Лекцыя 9 *Кароткая гісторыя турызма* 8
2.10 Лекцыя 10 *Традыцыйныя і спецыяльныя віды турызма* 8
2.11 Лекцыя 11 *Асновы экскурсійнага абслугоўвання музеяў і турыстычных арганізацый* 8
2.12 Лекцыя 12 *Напрамкі і перспектывы ўзаемадзеяння турыстычнай і музейнай дзейнасці ў Беларусі* 8
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 9
3.1 Семінарскі занятак 1 *Буйнейшыя музеі на турыстычнай карце Беларусі* 9
3.2 Семінарскі занятак 2 *Напрамкі і перспектывы ўзаемадзеяння турыстычнай і музейнай дзейнасці ў Беларусі* 9
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 10
4.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў 10
4.2 Пытанні да заліку 10
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вуэбнай дзейнасці студэнтаў 11
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 14
5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны 14
5.2 Асноўная літаратура 21
5.3 Дадатковая літаратура 21

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

“Уводзіны ў спецыяльнасць” – вучэбная дысцыпліна якая распрацавана для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны” (прафілізацыя: культурная спадчына і турызм). Дысцыпліна “Уводзіны ў спецыяльнасць” распачынае цыкл спецыяльных дысцыплін і дае зыходныя тэарэтычныя звесткі па асновах музеязнаўства і турыстычнай дзейнасці з улікам прыярытэтаў сферы культуры.

Міждысцыплінарны характар музеязнаўства дазваляе казаць аб збліжэнні двух накірункаў дзейнасці сучаснага грамадства – музейнай работы і турыстычнай дзейнасці. Уключэнне музеязнаўства ў сістэму вучэбных дысцыплін з'яўляецца неабходным элементам музейнай адукацыі і прызнаннем таго, што стаць кампетэнтным спецыялістам немагчыма без разумення заканамернасцей музеязнаўчых працэсаў і, асабліва, тэорыі і практыкі музейнай справы. Раскрыццё асноў турыстычнай дзейнасці неабходна для азнаямлення са спецыфікай развіцця міжнароднага і нацыянальнага турызму, асаблівасцямі работы ў сферы турызма. Пры выкладанні дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць” улічваецца яе сувязь з такімім дысцыплінамі, як “Гісторыя Беларусі”, “Усеагульная гісторыя”, “Гістарычнае краязнаўства” і інш.

*Мэта дысцыпліны* – сфарміраваць у студэнтаў першасныя прафесійныя кампетэнцыі ў сферы музеязнаўства і турызма, даць пэўны кірунак засваення вучэбных курсаў у адпаведнасці з зацверджанымі стандартамі навучання, а таксама накіраваць іх на арганізацыю самастойнай работы па пошуку, адбору і асэнсаванню прафесійнай інфармацыі.

*Задачы дысцыпліны:*

– сфарміраваць паўнавартаснае ўяўленне аб узаемадзеянні музейнай практыцы і турыстычнай дзейнасці;

– раскрыць асновы паняційна-катэгарыяльнага, тэрміналагічнага апарата музеязнаўства і турызма;

– выпрацаваць у студэнтаў элементарныя ўменні па апрацоўцы атрыманай інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі Інтэрнэт.

Змест дысцыпліны раскрывае аб’ект, прадмет і метады музеязнаўства, вызначае галіну музеязнаўства як частку навуковых ведаў, характарызуе музей як сацыяльны інстытут. Даецца характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы, дысцыпліна накіроўвае першакурснікаў на рацыянальную арганізацыю сваёй вучэбнай працы. Таксама разглядаюцца асноўныя кірункі сучаснай турыстычнай дзейнасці, асаблівасці і перспектывы развіцця Беларусі на міжнародным турыстычным рынку.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-

03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (прафілізацыя: культурная спадчына і турызм):

- СК-1. Прымяняць ў прафесійнай дзейнасці актуальныя тэарэтычныя і прыкладныя веды аб паходжанні і функцыянаванні музея, прынцыпах яго ўзаемадзеяння з грамадствам.

Засваенне дысцыпліны забяспечвае студэнтаў зыходнымі *ведамі аб:*

– змесце асноўных тэарытычных паняццяў курса і іх суадносінах;

– музеязнаўстве як навуковай дысцыпліне, якая раскрывае сродкі, метады і формы далучэння чалавека да свету культуры, вызначае механізм стварэння музея;

– музейных прадметах і іх уласцівасцях;

– аб асаблівасцях арганізацыі і развіцця турыстычнай дзейнасці.

Дысцыпліна накіравана на выпрацоўку ў студэнтаў першапачатковых *уменняў:*

– індывідуальнага ўсведамлення тэарэтычнага матэрыялу і сувязі яго з музейнай і турыстычнай практыкай, развіцця логікі вуснага і пісьмовага пераказу;

– выкарыстання базавай тэрміналогіі музеязнаўства і турызма;

– элементарнай апрацоўкі атрыманай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры і крыніц Інтэрнэта.

Акрамя гэтага, дысцыпліна дапамагае *авалодаць*:

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– уменнем выкарыстоўваць атрыманныя веды на практыцы пад час семінарскіх заняткаў;

– навыкамі творчага падыходу да музейнай і турыстычнай дзейнасці.

Пры выкладанні дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць” мяркуецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы і праблемны метады навучання.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё творчых магчымасцяў, пошук неабходнай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры, газетных публікацый, радыё- і тэле-інфармацыі, Інтэрнэт-крыніц. Выкарыстоўваецца кантэнт-аналіз крыніц, прысвечаных актуальным праблемам музеязнаўства і дзейнасці музеяў featureнага профілю, на падставе якіх кожны студэнт падрыхтоўвае вусныя адказы і прэзентацыі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне дысцыпліны “Уводзіны ў спецыяльнасць” усяго прадугледжана 90 гадзін, з якіх 34 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзіны, семінары – 6 гадзін. Форма правядзення бягучай атэстацыі – вуснае апытанне. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## План-канспект лекцый

### Уводзіны

Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі музейнай справы і турыстычнай дзейнасці на Беларусі. Задачы, структура і змест курса. Засваенне тэарытычных ведаў і практычных навыкаў. Формы кантролю. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Агульная характарыстыка крыніц і літаратуры.

### Раздзел I Асновы музеязнаўства

#### Тэма 1. Музеязнаўства як навука. Яе метады і задачы

Прадмет, мэты і задачы дысцыпліны “Музеязнаўства”. Месца музеязнаўства ў сістэме грамадскіх, тэхнічных і прыродазнаўчых навук. Міжпрадметны характар музеязнаўства. Узаемасувязь музеязнаўства і вывучэння турыстычнай індустрыі. Вызначэнне музеязнаўства як навукі. Аб'ект і прадмет музеязнаўства. Метады музеязнаўства. Структура музеязнаўства як навуковай дысцыпліны. Асноўныя гістарычныя перыяды развіцця музеязнаўства. Праблематыка і дасягненні музеязнаўства на сучасным этапе.

#### Тэма 2. Гісторыя музейнай справы на Беларусі

Зараджэнне збіральніцтва як сацыяльнай з’явы. Першыя музейныя зборы і скарбніцы на Беларусі. Прыватныя калекцыі беларускай шляхты і магнатаў. Даступнасць тагачасных калекцый для публікі. Пашырэнне прыватнага калекцыяніравання. Першыя публічныя музеі XIX ст. З'яўленне музеяў пры навучальных установах. Музеі навуковых устаноў. Стварэнне агульнадаступных музеяў на падставе прыватнай ініцыятывы. Савецкі перыяд ў дзейнасці музеяў. Дзейнасць краязнаўчых музеяў. Стварэнне сеткі дзяржаўных музеяў. Дзейнасць музеяў у ваенны і пасляванны час. Сучасныя музеі Беларусі і іх роля ў развіцці турыстычнай індустрыі.

#### Тэма 3. Сацыяльныя функцыі музея. Тыпалогія і класіфікацыя музеяў

Вызначэнне тэрміна "музей". Узнікненне музея ў грамадстве: навуковыя канцэпцыі і тэорыі. Этапы фарміравання музея як сацыяльнага інстытута. Сацыяльныя функцыі музея. Спецыфіка дзейнасці музея. Тыпы і профілі беларускіх музеяў. Асноўныя дзяржаўныя музеі Беларусі, іх дзейнасць і структура. Паняцце музейнай сеткі. Агульная характарыстыка музейнай сеткі Беларусі. Музейны турызм.

### Тэма 4. Асновы музейнага і турыстычнага заканадаўства

Савецкае заканадаўства ў галіне музейнай дзейнасці. Міжнародныя дакументы. Кодэкс музейнай этыкі. Кодэкс Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» (2017), асноўныя палажэнні і артыкулы. Палажэнні і інструкцыі па выкананні пэўных відаў работ у музеі.

Гістарычныя ўмовы для развіцця заканадаўства у галіне турызма. Асноўныя міжнародныя дакументы. Манільская дэкларацыя па сусветнаму турызму (1980), Хартыя турызма (1985), Гаагская дэкларацыя па турызму (1989), Глабальны этычны кодэкс турызма (1999), Квебекская дэкларацыя па экатурызму (2002), Асноўныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь "О туризме" (2021).

### Тэма 5. Накірункі дзейнасці сучасных музеяў

Навукова-фондавая работа. Паняцце навуковага камплектавання музейных фондаў. Вывучэнне музейных фондаў. Паняцці "музейны прадмет", "музейны экспанат", "музейны артэфакт", "музейная калекцыя". Улік музейных фондаў. Захоўванне музейных фондаў.

Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць. Асноўныя этапы праектавання музейнай экспазіцыі: навуковы і мастацкі. Музейная экспазіцыя як асноўная форма музейнай камунікацыі. Накіраванасць экспазіцыйнай дзейнасці на айчынных наведвальнікаў і замежных турыстаў. Стацыянарныя і перасоўныя выстаўкі.

Культурна-адукацыйная дзейнасць. Традыцыйныя формы работы з музейнай аудыторыяй. Музейныя фэсты, святы, тэатралізаваныя імпрэзы і іх уплыў на рынак турыстычных паслуг.

Навукова-даследчая праца. Напрамкі навуковай дзейнасці музея.

Інфармацыйныя тэхналогіі ў дзейнасці музеяў.

### Тэма 6. Буйнешыя музеі на турыстычнай карце Беларусі

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Гомельскі палацава-паркавы ансамбль. Музей "Замкавы комплекс "Мір". Нацыянальны гісторыка-культурны запаведнік "Нясвіж". Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Абласныя і рэгіянальныя музеі. Гісторыя развіцця беларускіх музеяў, накірункі іх дзейнасці, сучасны стан і песпектывы ўзаемадзеяння з турыстычнай сферай. Спецыфіка экспазіцыйнай, навуковай і культурна-адукацыйнай работы буйнейшых музеяў Беларусі. Роля музеяў і аб'ектаў турыстычнага паказу ў развіцці турыстычнай індустрыі.

## Р а з д з е л II Асновы турыстычнай дзейнасці

### Тэма 7. Паняцце турызма. Класіфікацыя турызма

Паняцце турызма і міжнароднага турызма. Фактары развіцця турызма. Функцыі турызма: рэкрыацыйная, азнаямляльная, развіваючая, забаўляльная і іншыя. Сацыяльнакультурныя, эканамічныя, палітычныя і іншыя фактары развіцця турызма. Класіфікацыя турызма па тыпах, відах і формах. Функцыянальная класіфікацыя турызма. Формы турызма. Матывацыя ў турызме.

### Тэма 8. Кароткая гісторыя турызма

Прычыны і час ўзнікнення турызма. Развіццё айчыннага і міжнароднага турызма. Падыходы ў перыядызацыі турызма. Першыя элементы турызма ў Старажытны час. Развіццё турызма у эпоху сярэднявечча. Турызм ў эпоху Адраджэння. Турызм у XVII – XIX стст. Турызм як масавая з'ява ў XX – пачатку XXI стст. Асаблівасці развіцця турызма на Беларусі на розных гістарычных этапах. Сучасны стан і перспектывы турызма ў краіне. Узаемасувязь пазнавальнага турызма і музейнай дзейнасці.

### Тэма 9. Традыцыйныя і спецыяльныя віды турызма

Спецыяльныя віды турызму. Рэлігійны турызм. Экалагічны і агратурызм. Рэкрэацыйны і пазнавальны турызм. Наведванне фестываляў, спартыўных і культурных мерапрыемстваў, як перспектыўны кірунак турыстычнай дзейнасці (падзейны турызм). Музейны турызм як перспектыўны кірунак для развіцця турыстычнай сферы ў Беларусі. Асноўныя фактары развіцця музейнага турызма. Стан і перспектывы музейнага турызма на Беларусі.

### Тэма 10. Асновы экскурсійнага абслугоўвання музеяў і турыстычных арганізацый

Сутнасць і функцыі экскурсіі. Класіфікацыя экскурсій. Спецыфіка музейнай экскурсіі. Асаблівасці распрацоўкі і правядзення выязных экскурсій. Выкарыстанне метадычных прыёмаў у экскурсіях. Методыка падрыхтоўкі новай экскурсіі і экскурсійнага тура. Методыка і тэхніка правядзення экскурсіі. Псіхалогія экскурсійнай работы. Прафесійнае майстэрства экскурсавода. Экскурсіі ў культурна-пазнавальным турызме.

### Тэма 11. Напрамкі і перспектывы ўзаемадзеяння турыстычнай і музейнай дзейнасці ў Беларусі

Прыродна-кліматычныя ўмовы для развіцця турызма ў Беларусі. Тэрытарыяльныя асаблівасці рэгіёнаў краіны ў прапанаванні турыстычных паслуг. Унутраны і знешні турызм: асноўныя кірункі. Асаблівасці турыстычных паслуг у краіне. Праблемы і перспектывы ўзаемадзеяння сучаснага турыстычнага бізнеса і практыкі беларускіх музеяў. Гісторыка-культурныя аб'екты і экспазіцыі нацыянальных і рэгіянальных музеяў на турыстычнай карце Беларусі.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай, так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да стварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, падрыхтоўка прэзентацыі гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

### Семінарскія заняткі 1
### Спецыфіка функцыянавання музея на сучасным этапе

1. Музеязнаўства як навука. Гісторыя, структура, сучасны стан.
2. Музей і яго функцыі. Класіфікацыя і тыпалогія музеяў.
3. Асноўныя накірункі музейнай работы.
4. Асноўныя музеі Беларусі.

Літаратура да тэмы 1:


1. Аб культуры: Кодэкс Рэспублікі Беларусь: уступ. у сілу з 3 лют. 2017 г. (са зменамі і дапаўненнямі) [Электронный ресурс] // Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2023–2024. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступа: 14.02.2024.
2. Бяспалая, М.А. Навукова-даследчая дзейнасць цэнтральных музеяў Беларусі: агульнае і асаблівае / М.А.Бяспалая // Веснік БДУКМ, 2010. – №4, с.112–117.
3. Бяспалая, М.А. Рэгіянальныя музеі Беларусі: сучасны стан і перспектывы развіцця / М.А.Бяспалая // Веснік БДУКМ, 2012. – №17, с.110–114.
4. Гужалоўскі, А.А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.
5. Шляхтина, Л.М. Основы музейного дела: теория и практика : учебное пособие [Электронный ресурс] / Л. М. Шляхтина. — 7-е, стер. — Санкт-Петербург : Планета музыки, 2021. — 248 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/156614. — Дата доступа: 14.02.2024.


### Семінарскія заняткі 2
### Асаблівасці развіцця турыстычнай дзейнасці Беларусі

1. Азначэнне паняцця “турызм”. Класіфікацыя турызма.
2. Гістарычнае развіццё турызма: сусветны і нацыянальны кантэкст.
3. Асаблівасці работы экскурсавода і экскурсійнае абслугоўванне.
4. Асноўныя накірункі турыстычнай дзейнасці на Беларусі.

Літаратура да тэмы 2:

1. Биржаков, М.Б. Введение в туризм / М.Б. Биржаков. – М., СПб. : Герда, 2007. – 576 с.

2. Дулов, А.Н. История путешествий и туризма : монография / А.Н. Дулов, К.А. Дюхова, Д.В. Юрчак. – Витебск : УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2011. – 139 с.

3. О туризме [Электронный ресурс]: Закон Респ. Беларусь, 11 ноября 2021 г., № 129-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2023–2024 . – Режим доступа : https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100129&p1=1&p5=0. – Дата доступа : 30.03.2024.

4. Родионова, Д.Д. Введение в профессию : учебное пособие [Электронный ресурс] / Д. Д. Родионова. — Кемерово : КемГИК, 2019. — 148 с. — Режим доступа : https://e.lanbook.com/book/156984. — Дата доступа : 14.03.2024.

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі і сучасным развіцці музейнай і турыстычнай дзейнасці. Прапануемыя тэмы: "Накірункі дзейнасці сучасных музеяў", "Кароткая гісторыя турызма", "Традыцыйныя і спецыяльныя віды турызму".

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, падрыхтоўка прэзентацый, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай, так і дадатковай літаратурай.

## 4.2 Пытанні да заліку

1. Музеязнаўства як навука: гісторыя і сучасны стан развіцця
2. Структура музеязнаўчай навукі
3. Прыватнаўласніцкія зборы XVI - XIX стст.
4. Музеі навучальных і навуковых устаноў
5. Савецкія музеі
6. Сучасная музейная сетка Беларусі
7. Музей як сацыякультурны інстытут
8. Фунцыі і асноўныя накірункі дзейнасці музея
9. Класіфікацыя і тыпалогія музеяў
10. Навукова-фондавая работа ў музеі
11. Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць музея
12. Культурна-адукацыйная дзейнасць ў музеі
13. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь: гісторыя і сучаснасць
14. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь
15. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны
16. Гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі Беларусі
17. Палаца-паркавыя ансамблі
18. Рэгіянальныя музеі Беларусі
19. Паняцце "турызм". Функцыі турызма
20. Класіфікацыя турызма
21. Спецыяльныя віды турызма
22. Падзейны турызм. Экстрымальныя віды турызму.
23. Рэлігійны турызм. Экалагічны і агратурызм.
24. Рэкрэацыйны і пазнавальны турызм. Музейны турызм.
25. Гісторыка-культурныя помнікі і экспазіцыі нацыянальных і рэгіянальных музеяў як асноўныя аб'екты турыстычнага паказа
26. Экскурсія як выхаваўчы і пазнавальны працэс
27. Асноўныя этапы падрыхтоўкі экскурсіі
28. Прыродна-кліматычныяўмовы для развіццятурызмаўБеларусі.

29. Тэрытарыяльныя асаблівасці рэгіёнаў краіны ў прапанаванні турыстычных паслуг.

30. Уяздны і выяздны турызм: асноўныя накірункі.

31. Праблемы і перспектывы сучаснага турыстычнага бізнеса ў Беларусі.

### 4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Выніковая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці прадугледжвае правядзенне заліка. Адказ на ацэнку роўную 4 балам і вышэй прадугледжвае атрыманне заліка па вучэбнай дысцыпліне.

| Балы | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў і кампетэнтнасці ў межах дысцыпліны; адмова ад адказу. |
| 2 (два) | Фрагментарныя веды ў рамках дысцыпліны; веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай дысцыпліны; няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых памылак; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 3 (тры) | Недастаткова поўны аб’ём ведаў у рамках дысцыпліны; веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выкладанне адказу на пытанні з істотнымі памылкамі; слабае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць у вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; няўменне арыентавацца ў сутнасці асноўных тэорый, канцэпцый і кірункаў вывучаемай дысцыпліны; пасіўнасць на практычных занятках, нізкі ўзровень культуры ў выкананні і афармленні заданняў. |
| 4 (чатыры) | Мінімальна дастатковы аб’ём ведаў у рамках дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне выкарыстоўваць яго ў вырашэнні стандартных (тыпавых) задач; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім ацэнку; работа пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 5 (пяць) | Дастатковыя веды ў аб’ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у рашэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную |

| | |
|---|---|
| | ацэнку; самастойная работа на практычных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у ра- шэнні вучэбных задач; засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім параўнальную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастаткова высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 7 (сем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх пастаўленых пытаннях у аб'ёме вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў рамках вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная самастойная работа на практычных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і |

| | |
|---|---|
| | афармлення заданняў. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку; актыўная сістэматычная самастойная работа на практычных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы, а таксама па асноўных пытаннях па-за яе межамі; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае, лагічна правільнае выкладанне адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні; бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне эфектыўна яго выкарыстоўваць у пастаноўцы і рашэнні навуковых і прафесійных задач; здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў рамках вучэбнай праграмы; поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай дысцыпліны; уменне свабодна арыентавацца ў тэорыях, метадах і кірунках дысцыпліны і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін; самастойная творчая работа на практычных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання і афармлення заданняў. |

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семінарскія заняткі | Колькасць гадзін кср | |
| | Уводзіны | 2 | | | |
| 1 | Музеязнаўства як навука. Яе метады і задачы | 2 | | | |
| 2 | Гісторыя музейнай справы на Беларусі | 2 | | | |
| 3 | Сацыяльныя функцыі музея. Тыпалогія і класіфікацыя музеяў | 2 | | | |
| 4 | Асновы музейнага і турыстычнага заканадаўства | 2 | | | |
| 5 | Накірункі дзейнасці сучасных музеяў | 2 | | 2 | Падрыхтоўка вусных паведамленняў і мультымедыйных прэзентацый |
| 6 | Буйнейшыя музеі на турыстычнай карце Беларусі | 2 | 2 | | Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| 7 | Паняцце турызма. Класіфікацыя турызма | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| 8 | Кароткая гісторыя турызма | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка рэфератаў |
| 9 | Традыцыйныя і спецыяльныя віды турызма | 2 | | 2 | Выбарачнае апытанне, падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый |
| 10 | Асновы экскурсійнага абслугоўвання музеяў і турыстычных арганізацый | 2 | | | Выбарачнае апытанне |
| 11 | Напрамкі і перспектывы ўзаемадзеяння турыстычнай і музейнай дзейнасці ў Беларусі | 2 | 2 | | |
| | **Разам: 34** | **24** | **4** | **6** | |

## 5.2 Асноўная літаратура


1. Глушкова, П. В. Основные направления музейной деятельности : учеб. пособие [Электронный ресурс] / П. В. Глушкова. — Кемерово : КемГИК, 2019. — 244 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/156969.
2. Гужалоўскі, А. А. Гісторыя музейнай справы : вучэб.-метад. дапаможнік / А. А. Гужалоўскі. - Мінск : БДУКМ, 2022. – 228 с.
3. Сафонов, А.А. Музейное дело и охрана памятников : учеб. и практикум для вузов / А.А. Сафонов. – Москва : Юрайт, 2022. – 330 с.
4. Шляхтина, Л.М. Основы музейного дела: теория и практика : учеб. пособие [Электронный ресурс] / Л. М. Шляхтина. — 7-е, стер. — Санкт-Петербург : Планета музыки, 2021. — 248 с. — Режим доступа: https://e.lanbook.com/book/156614.


## 5.3 Дадатковая літаратура


1. Аб культуры: Кодэкс Рэспублікі Беларусь: уступ. у сілу з 3 лют. 2017 г. (са зменамі і дапаўненнямі) [Электронный ресурс] // Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2023–2024. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступа: 14.02.2024.
2. Биржаков, М.Б. Введение в туризм / М.Б. Биржаков. – М., СПб. : Герда, 2007. – 576 с.
3. Бяспалая, М.А. Навукова-даследчая дзейнасць цэнтральных музеяў Беларусі: агульнае і асаблівае / М.А.Бяспалая // Веснік БДУКМ, 2010. – №4, С.112–117.
4. Бяспалая, М.А. Рэгіянальныя музеі Беларусі: сучасны стан і перспектывы развіцця / М.А.Бяспалая // Веснік БДУКМ, 2012. – №17, С.110–114.
5. Гужалоўскі, А.А. Гісторыя музейнай справы Беларусі : вучэб.-метад. дапам. / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : БДУ, 2012. – 303 с.
6. Дулов, А.Н. История путешествий и туризма : монография / А.Н. Дулов, К.А. Дюхова, Д.В. Юрчак. – Витебск : УО “ВГУ им. П.М. Машерова”, 2011. – 139 с.
7. О туризме [Электронный ресурс]: Закон Респ. Беларусь, 11 ноября 2021 г., № 129-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – 2023–2024. – Режим доступа : https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100129&p1=1&p5=0. – Дата доступа : 30.03.2024.
8. Основы музееведения : учебное пособие / отв. ред. Э.А. Шулепова. Изд.2-е, испр. – М. : Книжный дом “ЛИБРОКОМ”, 2010. – 432 с.